# ЗАКРЫЛАСЯ НАРАДА ЖОНАК СПЕЦЫЯЛІСТАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

## ВЫСТУПЛЕННЕ СТАРШЫНІ СНК БССР тав. Н. М. ГАЛАДЗЕДА

Учора з раніцы працягваліся выступленні дэлегатак. Першыя, шчырыя ад усяго сэрца словы і думкі кожная дэлегатка зварачвае да таго, хто прынёс вялікае шчасце совецкай жанчыне — да мудрага настаўніка і друга таварыша Сталіна. Пачуццём вялікай гордасці за сваю радзіму, за вялікую партыю Леніна—Сталіна запоўнены прамовы кожнага, хто выступіў з трыбуны нарады.

Цёпла сустрэлі ўдзельнікі нарады выступленне тав. Зязюлі —жонкі ваеннаслужачага №-скай кавдывізіі. Тав. Зязюля дзеліцца вопытам разгортвання грамадскай работы сярод жонак каманднага і палітычнага састава рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

— Мы займаемся ў гуртках самадзейнасці, засвойваем тэхнікай кавалерыйскай язды, вывучаем вайсковую справу. Мы гатовы разам з нашымі мужамі абараняць нашу шчаслівую радзіму, як сваю родную хату. Лозунгамі ў гонар вялікага Сталіна, у гонар першага маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава, пад бурныя апладысменты канчае сваю прамову тав. Зязюля.

Пытанням разгортвання культурна-масавай работы, ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці прысвячае сваю прамову старшыня ЦСПСБ тав. Кавальчук.

Бурнымі апладысментамі, лозунгамі ў гонар большавіцкай партыі, у гонар кіраўнікоў партыі і ўрада Совецкай Беларусі дэлегаты сустракаюць выступленне старшыні СНК БССР тав. Н. М. Галадзеда.

У сваёй простай змястоўнай прамове тав. Галадзед спыняецца на чарговых задачах жонак спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Асноўныя з іх: барацьба за ўздым калгаснай вытворчасці, за рэкордныя ўраджаі і высокую прадукцыйнасць жывёлагадоўлі, укараненне культуры ў быт рабочых соўгасаў і калгаснікаў.

Вялікае месца ў сваім выступленні тав. Галадзед адводзіць двум велізарнейшым дакументам — праекту закона аб забароне абортаў і праекту новай сталінскай Канстытуцыі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы